Жыві, Беларусь!

Народная Газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№ 238 (251) 11 снежня 1991 г. Серада.

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1990 ГОДА НА БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОВАХ.

Кошт: у розніцу — 10 кап. падпісны — 3 кап.

СОГЛАШЕНИЕ

о создании Содружества независимых государств

Мы, Республика Беларусь, Российская Федерация (РСФСР), Украина, как государства — учредители Союза ССР, подписавшие Союзный договор 1922 года, далее именуемые высокими договаривающимися сторонами, констатируем, что Союз ССР как субъект международного права и геополитическая реальность прекращает свое существование.

Основываясь на исторической общности наших народов и сложившихся между ними связях, учитывая двусторонние договоры, заключенные между высокими договаривающимися сторонами,

стремясь построить демократические правовые государства,

намереваясь развивать свои отношения на основе взаимного признания и уважения государственного суверенитета, неотъемлемого права на самоопределение, принципов равноправия и невмешательства во внутренние дела, отказа от применения силы, экономических или любых других методов давления, урегулирования спорных проблем согласительными средствами, других общепризнанных принципов и норм международного права,

считая, что дальнейшее развитие и укрепление отношений дружбы, добрососедства и взаимовыгодного сотрудничества между нашими государствами отвечают коренным национальным интересам их народов и служат делу мира и безопасности,

подтверждая свою приверженность целям и принципам устава Организации Объединенных Наций, хельсинкского Заключительного акта и других документов Совещания по безопасности и сотрудничеству в Европе,

обязуясь соблюдать общепризнанные международные нормы о правах человека и народов,

договорились о нижеследующем:

Статья 1.
Высокие договаривающиеся стороны образуют Содружество независимых государств.

Статья 2.
Высокие договаривающиеся стороны гарантируют своим гражданам независимо от их национальности или иных различий равные права и свободы. Каждая из высоких договаривающихся сторон гарантирует гражданам других сторон, а также лицам без гражданства, проживающим на ее территории, независимо от их национальной принадлежности или иных различий гражданские, политические, социальные, экономические и культурные права и свободы в соответствии с общепризнанными международными нормами о правах человека.

Статья 3.
Высокие договаривающиеся стороны, желая способствовать выражению, сохранению и развитию этнической, культурной, языковой и религиозной самобытности населяющих их территории национальных меньшинств и сложившихся уникальных этнокультурных регионов, берут их под свою защиту.

Статья 4.
Высокие договаривающиеся стороны будут развивать равноправное и взаимовыгодное сотрудничество своих народов и государств в области политики, экономики, культуры, образования, здравоохранения, охраны окружающей среды, науки, торговли, в гуманитарной и иных областях, содействовать широкому информационному обмену, добросовестно и неукоснительно соблюдать взаимные обязательства.

Стороны считают необходимым заключить соглашения о сотрудничестве в указанных областях.

Статья 5.
Высокие договаривающиеся стороны признают и уважают территориальную целостность друг друга и неприкосновенность существующих границ в рамках Содружества.

Они гарантируют открытость границ, свободу передвижения граждан и передачи информации в рамках Содружества.

Статья 6.
Государства — члены Содружества будут сотрудничать в обеспечении международного мира и безопасности, осуществлении эффективных мер сокращения вооружений и военных расходов. Они стремятся к ликвидации всех ядерных вооружений, всеобщему и полному разоружению под строгим международным контролем.

Стороны будут уважать стремление друг друга к достижению статуса безъядерной зоны и нейтрального государства.

Государства — члены Содружества будут сохранять и поддерживать под объединенным командованием общее военно-стратегическое пространство, включая единый контроль над ядерным оружием, порядок осуществления которого регулируется Специальным соглашением.

Они также совместно гарантируют необходимые условия размещения и функционирования, материального и социального обеспечения стратегических вооруженных сил. Стороны обязуются проводить согласованную политику по вопросам социальной защиты и пенсионного обеспечения военнослужащих и их семей.

Статья 7.
Высокие договаривающиеся стороны признают, что к сфере их совместной деятельности, реализуемой на равноправной основе через общие координирующие институты Содружества, относятся:

— координация внешнеполитической деятельности;

— сотрудничество в формировании и развитии общего экономического пространства, общеевропейского и евразийского рынков, в области таможенной политики;

— сотрудничество в развитии систем транспорта и связи;

— сотрудничество в области охраны окружающей среды, участие в создании всеобъемлющей международной системы экологической безопасности;

— вопросы миграционной политики;

— борьба с организованной преступностью.

Статья 8.
Стороны осознают планетарный характер чернобыльской катастрофы и обязуются объединять и координировать свои усилия по минимизации и преодолению ее последствий.

Они договорились заключить в этих целях Специальное соглашение, учитывающее тяжесть последствий катастрофы.

Статья 9.
Споры относительно толкования и применения норм настоящего Соглашения подлежат разрешению путем переговоров между соответствующими органами, а при необходимости — на уровне глав правительств и государств.

Статья 10.
Каждая из высоких договаривающихся сторон оставляет за собой право приостановить действия настоящего Соглашения или отдельных его статей, уведомив об этом участников Соглашения за год.

Положения настоящего Соглашения могут быть дополнены или изменены по взаимному согласию высоких договаривающихся сторон.

Статья 11.
С момента подписания настоящего Соглашения на территориях подписавших его государств не допускается применение норм третьих государств, в том числе бывшего Союза ССР.

Статья 12.
Высокие договаривающиеся стороны гарантируют выполнение международных обязательств, вытекающих для них из договоров и соглашений бывшего Союза ССР.

Статья 13.
Настоящее Соглашение не затрагивает обязательств высоких договаривающихся сторон в отношении третьих государств.

Настоящее Соглашение открыто для присоединения всех государств — членов бывшего Союза ССР, а также для иных государств, разделяющих цели и принципы настоящего Соглашения.

Статья 14.
Официальным местом пребывания координирующих органов содружества является город Минск.

Деятельность органов бывшего Союза ССР на территориях государств — членов Содружества прекращается.

Совершено в городе Минске 8 декабря 1991 года в трех экземплярах каждый на белорусском, русском и украинском языках, причем три текста имеют одинаковую силу.

За Республику Беларусь
С. ШУШКЕВИЧ
В. КЕБИЧ

За РСФСР
Б. ЕЛЬЦИН
Г. БУРБУЛИС

За Украину
Л. КРАВЧУК
В. ФОКИН

ПРА СУКАВАТАЕ БЕРВЯНО І БІТУЮ КАРТУ ІВАНА КАРАТЧЭНІ

Раніца ўчарашняга дня пачалася з прэс-канферэнцыі Старшыні Вярхоўнага Савета Станіслава Шушкевіча.

Здалося, што на ёй прысутнічалі ўсе журналісты з Мінска, што паспелі прачнуцца нязвыкла рана. Яны не паспелі наталіць той голад на інфармацыю, таму што сустрэчы ў сталіцы рэспублікі і асабліва ў Віскулях былі блакіраваны ад цікаўных вачэй прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі. Праўда, Станіслаў Станіслававіч запэўніў, што таямнічасць дыктавалася выключнасцю сітуацыі і ўжо ў час прыезду дзяржсакратара ЗША ў Мінск сакрэтнасці (калі толькі колькасць журналістаў не стане пагражаць бяспецы высокага госця) не будзе.

Усе пытанні (у асноўным) і адказы (без выключэння) былі цікавымі.

Кіраўнікі трох краін збіраліся абмеркаваць толькі эканамічныя пытанні, а выйшлі далёка за межы гаспадарчай сферы. Убачылі, што Ельцыну, Краўчуку і Шушкевічу няма аб чым спрачацца.

Чаму не запрасілі Назарбаева? Як толькі ўсвядомілі, што адбываецца ў Віскулях, неадкладна звязаліся з ім, запрасілі прыехаць.

Стала вядома, што паміж рэзідэнцыяй у Белавежскай пушчы і Крамлём адбылася тэлефонная размова. Які характар яна насіла? Вельмі цяжкі і няпросты. Станіслаў Станіслававіч толькі падкрэсліў, што не мае этычнага права паведамляць аб яе дэталях, але нягледзячы на цяжкасць, размова прайшла ў карэктных танах.

Пра адносіны Станіслава Шушкевіча да крамлёўскага цэнтра можна меркаваць па такой ацэнцы: «На пасяджэннях Дзяржсавету мы больш слухалі, чым гаварылі».

Дык ці будзе месца ў новай садружнасці пасадзе прэзідэнта? Канешне, гэта пытанне нельга разглядаць у адрыве ад лёсу Міхаіла Гарбачова як палітыка і дзяржаўнага дзеяча. Вось што пачулі ўдзельнікі прэс-канферэнцыі. З вуснаў Станіслава Станіслававіча прагучалі сустрэчныя пытанні: «А ці адчувалі вы наяўнасць сур'ёзнай прэзідэнцкай улады? Чаму ён ніколі ёю не карыстаўся?»

Што датычыць самой пасады, то мы не так даўно сцвярджалі, што крэсла Генеральнага сакратара ЦК КПСС можа ў наш час займаць толькі адзін чалавек— і ніхто больш. Прайшлі месяцы — знікла сама пасада Генсека, нешта хутчэй за ўсё зменіцца і ў адносінах да прэзідэнцтва.

Цяпер некаторыя сілы трубяць трывогу, нагнятаюць страсці антыканстытуцыйнасцю падзей, патрабуюць неадкладнага склікання з'езда народных дэпутатаў былога СССР. На думку Станіслава Шушкевіча, гэта неперспектыўны шлях, бо на з'ездзе не будзе кворуму. Украіна праігнаруе яго, многія дэпутаты з Беларусі падтрымаюць іх.

Такім чынам, усе палітычныя сілы павінны пераасэнсаваць свае адносіны да Масквы як да цэнтра. Ён стаў сукаватым бервяном на дарозе. Нельга пераступіць? Стала лягчэй абмінуць яго...

Так, Станіслаў Шушкевіч не паехаў у панядзелак на пасяджэнне Дзяржсавета, бо для яго больш важна зараз, як паставіцца Вярхоўны Савет рэспублікі да ідэі аб садружнасці трох дзяржаў. Калі дэпутаты падтрымаюць яго пазіцыю, то ён будзе ехаць у Маскву акрыленым, калі не, то ўзнікнуць вялікія цяжкасці.

Зранку на сесіі Вярхоўнага Савета вырашылі не спяшацца — вельмі сур'ёзнае рашэнне прыйдзецца прымаць, таму вырашылі абмеркаваць спачатку дакументы ў камісіях, правесці кансультацыі, аналіз...

Праўда, апоўдні Станіслаў Шушкевіч у тэлефоннай размове з Кіевам даведаўся, што Украіна ўжо ў 15 гадзін пачне абмяркоўваць адносіны да пагаднення трох. Відаць, гэта паскорыць ход падзей, але ў 13 гадзін, калі пісаліся гэтыя радкі, пра гэта яшчэ нічога не было вядома.

Ранішняе пасяджэнне прайшло даволі прадуктыўна. У апошні бой пайшлі прыхільнікі кампартыі Беларусі. На трыбуне іх пазіцыю адстойваў дэпутат Іван Каратчэня. Жыццё і час, казаў ён, паказваюць, што неабходна праявіць пачуццё розуму і адказнасці перад выбаршчыкамі і народам. Было відавочна, што карта, на якую настойліва ставіць Іван Міхайлавіч, будзе бітай. Хто яму дапамагаў? Уладзімір Сямёнаў, Анатоль Малафееў... Па іх меркаванню, падзеі заходзяць не туды, куды трэба, яны пужалі расслаеннем грамадства, супакойвалі «самых ретивых»...

Нічога не дапамагло. Праект, які прадстаўляў Іван Каратчэня, сабраў роўна 100 галасоў. Тут жа нарадзіўся жарт пра «чорную сотню». Што ж, чорныя падзеі, чорны гумар...

Большасцю галасоў прыняты праект, які прадставіў Савет Міністраў. Ён абвяшчае дзяржаўнай уласнасцю ўсю рухомую і нерухомую маёмасць КПБ—КПСС, у тым ліку і грашовыя сродкі ў рублях і замежнай валюце, змешчаныя ў банках, страхавых акцыянерных таварыствах, сумесных прадпрыемствах і іншых установах. На працягу трох дзён будуць узяты на ўлік усе грашовыя сродкі, на працягу месяца вызначыцца і парадак перадачы маёмасці. Прыярытэт— за навучальнымі ўстановамі, арганізацыямі сацыяльна-культурнай сферы.

У неабходнасці менавіта такога рашэння актыўна пераконвалі народныя дэпутаты Дзмітрый Булахаў, Аляксандр Лукашэнка, Зянон Пазьняк, Віктар Ганчар, Яўген Глушкевіч, Міхась Мацюшонак.

Партыя пазбаўлена багатай маёмасці (пазіцыя Станіслава Шушкевіча, дарэчы, была жорсткай, ён гаварыў учора, што партыя яе нарабавала, забірала ў дзяржавы, у народа), цяпер застаецца пачакаць, колькі застанецца прыхільнікаў з ліку былых апаратчыкаў пры немагчымасці перамяшчацца выключна ў «Волгах», збірацца ў фанераваных кабінетах...

Вярхоўны Савет у які ўжо раз імкнуўся прыняць закон аб дзяржаўных святах. Перашкодай зноў і зноў становяцца розныя адносіны да таго, быць 7 лістапада чырвонай датай альбо чорнай. Вельмі слушная думка аб тым, што ніхто нікому не замінае святкаваць гадавіны кастрычніцкай рэвалюцыі (цяпер усё часцей яе называюць пераваротам). Хочаш — святкуй пасля работы...

Не хапіла ўсяго некалькі галасоў (170 дэпутатаў падтрымалі законапраект) і — ён пакуль што знаходзіцца ў падвешаным стане. Праўда, эканоміка наша патрабуе больш думаць пра работу, чым пра святы. Але ж мы жывыя людзі — і ў самы цяжкі час усё-такі хочацца думаць і пра магчымасць павесяліцца ў недалёкім будучым.

Абмяркоўвалася на сесіі і такое дзяржаўнае пытанне, як эталонны выгляд сцяга і герба. Гэта далёка не тэхнічнае пытанне. Ветэраны, напрыклад, выказалі сваё незадавальненне крыжам на гербе. На гэта намеснік старшыні камісіі Алег Трусаў адказаў, што на нашых землях крыжа баіцца толькі нячыстая сіла. Гэта зноў-такі чорны гумар... А калі ўсур'ёз, то дэпутатаў непакоіла, як выхаваць павагу да дзяржаўнай сімволікі. Гэта таксама адна з умоў сілы краіны.





Мікалай ГАЛКО.
Фота Сяргея ГРЫЦА.

ПАСТАНОВА

Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб прызнанні паўнамоцтваў народнага дэпутата Рэспублікі Беларусь, выбранага 2 снежня 1991 года

Разгледзеўшы прадстаўленне Мандатнай камісіі, Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Прызнаць паўнамоцтвы народнага дэпутата Рэспублікі Беларусь ІЗВАЛАВАЙ Надзеі Якаўлеўны, выбранай 2 снежня 1991 года ад арганізацыі ветэранаў Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С. ШУШКЕВІЧ.

10 снежня 1991 г.
г. Мінск.

Факты Аргументы Комментарии Суждения

«Рупь» за градус

СЛАВГОРОД. Отныне поллитровка водки продается в городе по 40 рублей.

Такое решение принял районный Совет народных депутатов в целях укрепления ослабшего бюджета района, а также пресечения спекуляции.

Рубль за градус не совсем устраивает жителей города (раньше, кстати, именовавшегося Пропойском). Но любителям выпить, как говорят, деваться некуда, и они выкладывают четыре червонца за бутылку.

Константин КУДЛАЕВ.

Сердце мое — не камень

Как должное восприняли ведущие сотрудники кардиологического центра из Литвы приглашение в Витебск для участия в сложных операциях на сердце.

Врачебная «интербригада», куда входили витебские и каунасские специалисты, успешно провела вживление электрокардиостимуляторов в сердца пациентов, жизнь которых была под угрозой. Подобные операции, ставшие привычными на Западе, в Витебской области сделаны впервые. Это стало возможным благодаря ассоциации на базе железнодорожной клиники независимой ассоциации «Знание и здоровье» под руководством профессора мединститута Владимира Лоллини. Одним из основателей ассоциации стал областной совет профсоюза негосударственных предприятий «Содружество». Он же обеспечил льготную и финансирование дорогостоящих операций.

Сергей БУТКЕВИЧ.

Без бумажки мы букашки

Одним из первых документов, подписанных мэром Магнитогорска Вадимом Клюгантом, стало постановление о порядке подготовки и издания постановлений.

«Урал-акцепт».

Сицилия славится мафией. И апельсинами

МОГИЛЕВ. **До двухсот тонн апельсинов и других свежих фруктов будет ежемесячно поставляться в областной центр с Сицилии.**

Для этого, а также доставки других грузов, прокладывается воздушный мост между Могилевом и Италией. Это один из результатов деловых контактов представителей власти Могилева с итальянцем в рамках деятельности Белорусской торговой палаты.

Николай КОМЛЕВ.

Ищи ветра в поле?

БРЕСТ. **В ходе преследования обидевших польского гражданина воров одним из милиционеров был утерян пистолет Макарова с восемью патронами.**

Милиция через газету обратилась к землякам с убедительной просьбой вернуть оружие.

Василий САРЫЧЕВ.

Здесь будет город заложен...

...Но не «назло надменному соседу», то бишь Витебску, а ему же на благо.

Так, во всяком случае, уверяют руководители независимого профсоюза предприятий, которому власти областного центра позволили развернуть строительство города-спутника «Витебский посад». В кооперативном поселке из 1200 частных домов предполагается поселить пайщиков новостройки, нуждающихся в жилье.

Профсоюз «бизнесменов» планирует организовать при «Витебском посаде» широкую сеть приватных промыслов и услуг: от мясо-молочных ферм до малых предприятий по производству ходовых товаров. Преимущественное право на работу в этом секторе будет предоставлено членам жилищного кооператива.

Сергей БУТКЕВИЧ.

Иди и купи

В открывшемся в Минске отделении регионального банка «Комплекс» скоро можно будет за рубли приобрести валюту.

Как заявил управляющий ОРБ Евгений Кравцов, вопрос решится, по-видимому, в течение этой недели. Стоимость одного доллара будет приблизительно сто рублей.

Сейчас банк производит обмен «валюты на валюту», а также покупает СКВ у граждан и предприятий.

Виктор АНАТОЛЬЕВ.

Вкратце

* Президент СССР М. С. Горбачев, признав подписанное в Минске руководителями Беларуси, РСФСР и Украины Соглашение о создании Содружества независимых государств правомерным, в то же время назвал появление документа скоропалительным и в дальнейшем он не исключил возможности проведения всенародного референдума по этому вопросу.

* Президент Украины Леонид Кравчук сказал на пресс-конференции, что, по его мнению, к Содружеству независимых государств присоединятся Казахстан, возможно, страны Прибалтики, а также некоторые страны бывшего СЭВ, в частности Болгария.

* Советский Союз продал в Японию 12 тонн золота с января по август этого года. Как сообщил представитель компании «Танака Кикиндзоку», у него нет ощущения, что в Союзе острая нехватка золота.

* В соответствии с требованиями ООН Ирак уничтожил свое «суперорудие», которое якобы было способно посылать снаряды на расстояние до 1000 километров.



Рисунок Олега ПОПОВА.

Колбаса есть. Стоит только поискать

В Москве сейчас только и говорят об острой нехватке продуктов. А между тем продукты в городе есть.

Крупный склад их случайно обнаружен на днях в квартирах руководящих работников одного из магазинов, расположенного почти в центре столицы. Стоимость припрятанного товара исчисляется шестизначной цифрой. Изъяты и крупные суммы купюр.

А попались жулики от госторговли при отпуске с черного хода средь бела дня 52 батонов сырокопченой колбасы, 20 килограммов сахара в руки спекулянтов. Конечно же, за взятку.

Только в декабре столичная милиция обнаружила в темных углах госторговли сотни тысяч банок мясных и рыбных консервов, почти на миллион рублей водочных, кондитерских, колбасных изделий, кофе.

Леонид ФАДЕЕВ.

Вагончик тронется. А мы останемся

Похоже, с нового года купить железнодорожный билет за границу можно будет только за валюту.

Как стало известно, управление Белорусской железной дороги обратилось в Совмин республики с просьбой разрешить с первого января перейти на валютный расчет с зарубежными странами. Определена уже и стоимость билета: из Минска до Берлина —55 долларов, до Варшавы —19, Праги —39 и Софии —55.

Уже дано «добро» Минфином и Внешэкономбанком РБ. Остановка — за Госкомитетом по внешним экономическим связям республики. По мнению руководителей железной дороги, чем быстрее правительство даст зеленый свет валютным поездам, тем больше надежды, что не прервется сообщение с зарубежными странами.

Для тех, у кого нет СКВ, планируется продавать билеты по соответствующему курсу в рублях.

Виктор ЛЕЩЕНКО.

Зачем ворам миноискатель?

ВИТЕБСК. **Почти в буквальном смысле печатали деньги пятеро молодых людей, арестованных в областном центре сотрудниками межрегионального управления по борьбе с организованной преступностью МВД БССР.**

С помощью простенького ручного станка преступники наладили выпуск фальшивых водочных талонов, которые безоговорочно принимались в магазинах, где охотно смотрели на подделку сквозь пальцы. Сколько спиртного утекло таким образом налево, пока трудно сказать, но то, что в машине изъято 15.000 «липовых» талонов, впечатляет, как и многое другое конфискованное у них милицией: 40.000 рублей, 13 мешков сахара, 250 бутылок водки, огнестрельное оружие с боеприпасами и даже... миноискатель. Последний предмет, возможно, пригодился бы для разведки кладов, но зачем искать давно спрятанные богатства, если можно почти без труда сегодня брать то, что плохо лежит?

Сергей БАЛЦЕВИЧ.

Еще один побратим

Недавно делегация г. Минска во главе с первым заместителем Мингорисполкома Григорием Тишкевичем посетила г. Чанчунь в Китае.

Цель поездки — установление побратимских связей. Этот китайский город близок к Минску как по количеству населения, так и по промышленному развитию. Как и у нас, там хорошо развито автомобилетракторостроение, имеется крупный мотовелозавод, другие промышленные и перерабатывающие предприятия.

В перспективе — экономическое и культурное сотрудничество, установление прямых контактов между предприятиями и предпринимателями, обмен опытом и другие формы сотрудничества.

Иван КРАВЧУК.

Космический Разум приказал нам долго жить

ЕКАТЕРИНБУРГ. **Здесь состоялся четвертый съезд Российского союза борьбы за народную трезвость.**

Делегаты форума, а их было около ста, отмечали, что должны сами взяться за духовное возрождение России, которое может спасти народ от пьянства. Лидер Движения за здоровый образ жизни Юрий Соколов специально прилетел из Санкт-Петербурга, чтобы донести до делегатов сообщение, полученное от «высшего космического Разума», который посоветовал всем отказаться от алкоголя, мяса и рыбы. А тех, кто не откажется, ждет гибель в 2003 году, предупредил Разум...

«Урал-акцепт».

«Горячий» телефон 32-24-02 работает ежедневно с 9 до 11 часов.

Улада: каму належыць і служыць?

«Я не магу і не маю права парушаць законы, якія зацвярджаў»

— неаднойчы паўтараў на прыёме грамадзян Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслаў Шушкевіч.



Як ні дзіўна, але ў апошні час у рэдакцыі ўсё часцей пачалі раздавацца тэлефонныя званкі наконт таго, што Станіслаў Шушкевіч, стаўшы Старшынёй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, фактычна не вядзе прыём грамадзян ні як дзяржаўны дзеяч, ні як дэпутат і наогул рэдка сустракаецца са сваімі выбаршчыкамі. Маўляў, дзе падзеўся той Шушкевіч-дэмакрат часоў перадвыбарнай барацьбы, першых гадоў абнаўлення. Ды і іншыя адказныя кіраўнікі Вярхоўнага Савета не надта прагнуць на прыём грамадзян.

Не буду катэгарычна аспрэчваць такія безапеляцыйныя меркаванні і заявы. Тут недзе доля ісціны ёсць. Вірусаў бюракратычных адпісак, валакіты, фармалізму мы поўнасцю не пазбавіліся. Ды і немагчыма адным махам кавалерыйскай шашкі адсекчы тое, што збіралася семдзесят гадоў. Што і казаць, хіба мы не помнім, нават пяток гадоў назад людзі не ішлі так густа, а то і проста ламаліся напрамую ў Вярхоўны Савет. Ды з патрабаваннем не да абы каго, а да самога Старшыні. Бо, маўляў, толькі ён можа рашыць іх справу.

Што тычыцца канкрэтна Станіслава Станіслававіча, то з новай пасадай у яго, безумоўна, спраў патроілася. Чуткі наконт таго, быццам ён не вядзе прыём грамадзян—проста лухта. Як сустракаўся ён з людзьмі, так і сустракаецца. Праўда, нават калі б ён займаўся штодзённа прыёмам грамадзян, то ўсё роўна б часу не хапіла. Ды што там дня — і ночы. І былі б незадаволеныя. Вось і даводзіцца яму ў найскладанейшых палітычных і эканамічных умовах ашчаджаць і выкройваць час для прыёму і гутарак з грамадзянамі. Магчыма, цяпер яму ўдасца рабіць гэта не так часта, як раней, але па яго словах, такія сустрэчы не дазваляюць адарвацца ад самых вірлівых глыбінь чалавечага жыцця, адчуваць пульс часу, жыць трывогамі і надзеямі простага чалавека і ведаць, па чым фунт ліха ў 90-гадовай бабулі, і якія пражэкты ў самаўпэўненага новаспечанага нуварыша-бізнесмена ці вясковага фермера.

Мы не выбіралі спецыяльна дня прыёму, а трапілі, як кажуць, знянацку, дамовіўшыся за дзень да яго, на што Шушкевіч ахвотна згадзіўся.

СТРАСЦІ ВАКОЛ ДОМА

Ён увайшоў упэўнена і ўрачыста. Адразу адчувалася: чалавек заслужаны. Гэта быў дырэктар Мінскага вытворчага аб'яднання па птушкагадоўлі Дубоўскі.

За ім ішлі з партфелямі і папкамі двое яго людзей. Неяк ненатуральна ўрачыста і гучна пачаў віншаваць Шушкевіча і зычыць новых вышынь, маючы на ўвазе прэзідэнтства.

Тут жа ўручаліся сувенірныя вырабы падсобнага цэха. Шушкевіч зніякавеў, сумеўся, але пасля знайшоўся і сказаў: «Ну вось і добра, збіраюся наведаць дзіцячую бальніцу, неблагія падарункі дзеткам будуць».

Канстанцін Мікалаевіч пачаў расказваць пра поспехі аб'яднання. Лічбы сыпаліся як з рога. Кожная параўноўвалася з леташняй і цягнула на вагу і лік значна больш. А ён, шаноўны дырэктар, дапамагае ўсім, чым можа. Нават фірменны магазін адкрыў. А там, Божа мой, такіх прысмакаў і далікатэсаў, што аж галава кругам пайшла. А як ён дапамагае ім (гэта тым, што жывуць у мікрараёне, дзе ён сабраўся 9-павярховы дом для сваіх рабочых узводзіць)! І некалькі вуліц заасфальтаваў, і стол заказаў адчыніў (у тыдзень можна тры дзесяткі яек і тры кілаграмы курацiны ўзяць), а яны, няўдзячныя, пішуць, скардзяцца... Ды не ўсе. Ёсць там дзве-тры бабкі-пенсіянеркі, завадатаркі. Нейкія Бабко, Алупка.

Шушкевіч слухаў, хітаў галавой і раптам спытаў:

— Гэта добра, што вы так працуеце, планы перавыконваеце, але чаму тады няма яек і курэй у магазінах?

— А мы тут не вінаваты, наша аб'яднанне працуе добра, усё больш і больш прадукцыі даём. Праблема ляжыць глыбей...—неяк зніякавеў, азірнуўся на сваіх памочнікаў Дубоўскі.

Далей размова пайшла па сутнасці справы. Аб'яднанне ў Цэнтральным раёне г. Мінска, вырашыла пабудаваць для сваіх рабочых шматкватэрны дом. Здавалася б, што тут заганнага. Вітаць толькі трэба. Мінскі гарвыканкам дазвол даў. Хутка зрабілі праект. Але ўся справа, што новабудоўлю садзілі ў прыватны сектар з дамамі ўласнай забудовы. Не ўлічылі і другую акалічнасць — на двары быў 1988 год. Самы час мітынгавай дэмакратыі. Вось і ўзнялося на «абарону» сваіх правоў пакрыўджанае адзінаццацітысячнае насельніцтва мікрараёна. Маўляў, у нас ніякага сацкультбыту, ні крам, ні іншых умоў, а тут такое будаўніцтва. Куды глядзяць улады, што думаюць пра простых людзей, чаму не дбаюць пра іх інтарэсы і не абараняюць? Але тады яшчэ магутны Дубоўскі, які не раз адной нагой адчыняў дзверы ў высокія кабінеты, змог адстаяць рашэнне.

Сёння гэта справа ўяўляе ёмісты том перапіскі з палярна супрацьлеглымі думкамі і меркаваннямі самага высокага ўзроўню ў рэспубліцы.

Мяне цікавіла іншае. Як будзе рэагаваць на ўсё гэта Станіслаў Станіслававіч. Прысутнічаў жа толькі адзін бок. Праўда, злёгку паўшчуваўшы Канстанціна Мікалаевіча, ён даў «дабро», папярэдне сказаўшы, што камісія па пытаннях архітэктуры і будаўніцтва на чале з Мікалаем Капытовым у даным выпадку памылілася.

Не буду абмяркоўваць рашэнне, але, баюся, што яно наўрад ці будзе канчатковым.

Бо ультыматыўныя заявы з аднаго боку — ляжам пад машыны і бульдозеры, і з другога — не дадзім гораду ні яек, ні птушкі,— відаць, не галаслоўныя. «Эпапея» ж цягнецца ўжо 4 гады, і страсці вакол дома накаліліся да тэмпературы выбуху і плаўлення. Як тут быць?

«АДДАЙЦЕ ТОЕ, ШТО Ў НАС АДАБРАЛІ...»

Страсці па касцёлу пасля гэтага мне падаліся напачатку нечым накшталт лёгкага праменаду. Але, як аказалася, па сваёй глыбіні і маштабнасці яны куды больш складаныя. Ды і ці справядліва іх называць страсцямі. Сёння вернікі патрабуюць — і гэта справядліва — «Вярніце, аддайце нам тое, што вы па-драпежніцку адабралі, духоўна аграбіўшы нас».

Дыялог з дырэктарам Раўбіцкага музея народнага мастацтва (будынак былога касцёла) Таццянай Сцёпінай і дырэктарам Дзяржаўнага мастацкага музея Станіслаў Шушкевіч правёў бліскуча. Ён, па-першае, паказаў сябе глыбокім знаўцам гэтай праблемы, умелым тактыкам і палітыкам. Па-другое, Шушкевіч хоць і абачліва, але настойліва ішоў на кампраміс з атакуючай маналогамі Таццянай Іванаўнай. І хаця яе зразумець у пэўнай ступені можна, але і вернікаў (а яна не скупілася для іх характарыстыкі даволі моцных эпітэтаў) таксама выслухаць і зразумець трэба.

Дарэчы, як заўважыў Станіслаў Станіслававіч, гэта праблема не аднаго касцёла ці царквы. Тут пытанне неабходна вырашаць на дзяржаўным узроўні. Трэба раз і назаўсёды акрэсліць, што перадаецца вернікам, а што застаецца маёмасцю дзяржавы. Таму за стол перамоў, рады і пагадненняў варта сесці як дзяржаўным мужам, так і прадстаўнікам духавенства ўсіх канфесій. І не трэба дапускаць і паўтараць памылак тых жа суседзяў-украінцаў ды і сваіх мінулых.

«ВАША ПАЗІЦЫЯ МЯНЕ НЕ ПЕРАКОНВАЕ...»

Зусім іншай атрымалася гаворка ў Старшыні ВС з Тамарай Белавокай, старшынёй Беларускага камітэта «Дзеці Чарнобыля». Дарэчы, як я ні стараўся потым падлічыць і ўдакладніць, колькі сёння такіх камітэтаў у рэспубліцы, так да канца і не высветліў.

Ну, а па пытаннях Чарнобыля, зразумела, Шушкевіча голымі рукамі не возьмеш, лічбамі не запалохаеш. Фізік па адукацыі, ён добра разумее, што такое ёдавая атака, што азначае для здароўя чалавека апраменьванне цэзіем, плутоніем і іншымі нябачнымі «атамнымі ворагамі» нашага арганізма.

А гаворка вялася вакол фінансаў (валютных сродкаў) для будаўніцтва дзіцячай паліклінікі ў Аксакаўшчыне, а таксама двух дыягнастычных цэнтраў. Здавалася, такое трэба толькі вітаць. Але, каб не быць галаслоўным, прывяду найбольш важны ўрывак з даволі вострага дыялогу.

Т. Б. Мы ствараем малыя прадпрыемствы і прыйшлі за фінансавай дапамогай.

С. Ш. Усё трэба рабіць пад эгідай Міністэрства аховы здароўя. У нас пакуль шмат блытаніны. Асабліва калі за такую складаную справу бяруцца дылетанты. Я не магу садзейнічаць разладу паміж дзяржаўнымі органамі і грамадскімі арганізацыямі. Дарэчы, у Вярхоўнага Савета ніякіх сродкаў няма.

Т. Б. Але ж каб не тая замежная дапамога, то ў нас бы нічога не было?

С. Ш. Вы казыраеце аднаразовымі шпрыцамі і інструментарыем. Але тыя замежныя прафесіяналы здзіўляюцца і гавораць: «Кіпяціце яго, як трэба, і мыйце рукі, а не карыстайцеся крэмамі. А калі наадварот, то трэба разганяць такую медыцыну».

Т. Б. Мы больш года біліся, каб арганізаваць выязныя брыгады. Міністэрства гаварыла — нельга. Цяпер створаны такія брыгады. А мы бяром той кавалак работы, які можам адужаць.

С. Ш. Ваша пазіцыя мяне не пераконвае. Вы гаворыце: «Дайце валюту і мы ашчаслівім дзяцей». А ў нас грошай не хапае на паўнацэннае харчаванне. Я не прафесіянал, каб даваць медыкам парады. Вы — прафесіяналы, вы і рашайце. Але я не магу садзейнічаць развалу таго, што яшчэ трымаецца. Трэба ўдакладняць і ўмацоўваць дзяржаўныя структуры. І мне проста брыдка, калі дзеці за час пералёту на Кубу атрымалі большую дозу, чым за тры гады ў Гомельскай вобласці. Я таксама не магу паўплываць на грамадскія арганізацыі, якія прытрымліваюцца супрацьлеглых поглядаў. Але мне сорамна, калі адна арганізацыя ў Германіі прапаведуе адно, а другая — адваротнае. Трэба рабіць справу ўнізе.

Т. Б. Я не «свячуся» ў вярхах і не прымаю вашы абвінавачванні. Менавіта мы працуем унізе.

С. Ш. Вось гэта і добра. Але я не магу абвінавачваць і здымаць міністра Казакова. Я накірую вашы прапановы ў адпаведныя камісіі ВС. Паверце, гэта вельмі складанае пытанне і я магу памыляцца. Няхай спецыялісты ўсё разгледзяць.

«Я ХАЧУ АДКРЫЦЬ СВАЮ СПРАВУ»

«Калі мне было 8 месяцаў, забралі бацьку. Не даехаў нават да Ленінграда — памёр. Мы жылі ў вёсцы. Гэта я пасля вайны ў Стоўбцы перабраўся і пабудаваў свой дом. Дык ці трэба каму гаварыць, як жылі. У канцы года выклікалі ў сельсавет і пад маўзерам заставілялі на той мізэрны заробак падпісвацца на аблігацыі. Не падпішашся — дарога туды.

Неяк выжылі. Я заўсёды любіў парадак. Асабліва на рабоце. Рабіў добра. Гадзіннікавым майстрам быў. І зарабляў добра. А гэта многім не падабалася. Я не мог цярпець непарадкаў, разбэшчанасці, недысцыплінаванасці. Пра недахопы гаварыў як на рабоце, так і вышэйшаму начальству. Зрэзалі расцэнкі. Неаднойчы звяртаўся з гэтымі пытаннямі да старшыні Стаўбцоўскага райвыканкама Уладзіміра Лазара — не дапамагала. Дырэктар КБА быў непрабіваемы. Таму і існаваў у гэтай службе дух гультайства, ліслівасці, падазронасці і стукацтва. А начальніцкія рукі адна другую добра мылі. Таму мяне адразу ж, дзень у дзень, адправілі на пенсію».

Знаёмая сітуацыя. І вось ужо тры гады б'ецца Канстанцін Швец як рыба аб лёд. Не, ён не хоча аднавіцца на рабоце. Хоча адкрыць сваю справу. Просіць, дамагаецца невялічкага памяшкання, каб адкрыць сваю майстэрню па рамонту гадзіннікаў. Ён абяцае павялічыць гарантыю рамонту ў два разы, адзін замяніць работу тых трох з КБА. Здавалася, зялёнае святло трэба ўключаць, даваць дарогу такім людзям, але ў Стоўбцах гэтага не бачаць, няма для Канстанціна Сяргеевіча каморкі паўтара на паўтара метра. А можа, справа ў іншым? Відаць, як агню ці якой заразы баяцца ў Стоўбцах прыватніка, а па-мясцоваму, кулака Швеца. А Лазар на яго шматлікія звароты толькі рукамі разводзіць — прыйдзецца звальняць тых трох, бо ведае, што Швец іх заткне за пояс і яны застануцца без работы. Вось дайшоў ён аж да Шушкевіча. А што можа вярхоўная ўлада? Станіслаў Станіслававіч тлумачыць, што гэта кампетэнцыя мясцовых улад.

Таму варта толькі нагадаць спадару Лазару пра апошнія законы, прынятыя Вярхоўным Саветам, дзе прадпрымальніцтву, дзелавым людзям мясцовыя ўлады павінны ўсебакова садзейнічаць, дапамагаць, аказваць падтрымку.

«ЗАЎТРА НАС МОГУЦЬ ВЫКІНУЦЬ НА ВУЛІЦУ»

Людзі з Баранавіч прыехалі, як кажуць, амаль на хвост прыёму. Але Шушкевіч неадкладна запрасіў у пакой. Гэта былі старшыня прафкама Баранавіцкага авіярамонтнага завода Мікалай Чыжыкаў і яго намеснік Яўген Даўгіловіч. Іх узбуджанасць, усхваляванасць перадаліся і Старшыні ВС. Ён уважліва слухаў, таропка ўсё занатоўваў.

А сутнасць справы ў тым, што буйнейшы ў рэспубліцы авіярамонтны завод у выніку канверсіі можа з дня на дзень аказацца па-за справай, без заказаў, а больш 2000 высокакваліфікаваных рабочых апынуцца на вуліцы. Карацей, стануць беспрацоўнымі. Да гэтага часу завод падпарадкоўваецца Міністэрству абароны. Тут вёўся рамонт, прафілактыка самалётаў. За рамонт самалётаў для іншых краін міністэрства атрымлівала мільённыя валютныя прыбыткі. Заводу, рэспубліцы ад гэтага нічога не перападала. Ваенныя прывыклі жыць па загаду. Таму і цяпер у гэтай сітуацыі за два месяцы ніхто з начальства не з'явіўся. Камандаванне ваенна-паветраных сіл ніякіх гарантый не дае, як і не вызначае статус авіяцыйнага рамонтнага прадпрыемства.

Звярталіся прадстаўнікі калектыву і ва Упраўленне грамадзянскай авіяцыі рэспублікі. Там толькі віталі іх прапановы. А справа ў тым, што беларускі авіятрад вымушаны рамантаваць свае самалёты на Украіне, у Расіі і за гэта плаціць вялікія грошы. Дзіўна атрымліваецца, але факт. А ў выніку такой вось дзіўнай канверсіі калектыў апынуўся на мяжы сацыяльнага ўзрыву, рабочыя бяздзейнічаюць, туляюцца з вугла ў вугал і хрысцяць апошнімі словамі ледзь не самога Усявышняга. Ды і зарплату разбавілі да ватэрлініі 400 рублёў. Карацей, магутны высокапрафесійны калектыў пачаў раз'ядаць вірус карозіі, упадку, няўпэўненасці. «Мы прыехалі прасіць не грошы, а работу»,— такі апошні аргумент паклалі на шалі свайго звароту Чыжыкаў і Даўгіловіч.

Рэакцыя Станіслава Шушкевіча была імгненнай і канкрэтнай.

— Тэрмінова перагавару з Кебічам, з маршалам Шапашнікавым, накіруем экспертаў, спецыялістаў. Дам даручэнні адпаведным камісіям Вярхоўнага Савета. Нельга высокапрадукцыйныя тэхналогіі перапрафіліраваць і раздрабляць. Гэта злачынства.

Вердыкт кароткі, але канкрэтны. З канкрэтнымі даручэннямі. Думаецца, тут Шушкевіч не адступіцца ні на ёту і ўсё зробіць, каб завод і людзі паслужылі Айчыне і народу. І гэта не высокія словы. Тут яго ўмяшанне жыццёва неабходна і важна.

КАМЕНТАРЫЙ загадчыка сектара па прыёму грамадзян Сакратарыята Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Анатоля КРАСУЦКАГА.

Перамены ў палітычным, эканамічным і грамадскім жыцці рэспублікі выклікаюць вострую і зацікаўленую рэакцыю людзей. Расце іх палітычная свядомасць і актыўнасць, выразна акрэсліваюцца грамадзянскія пазіцыі.

Розныя інтарэсы прыводзяць людзей у прыёмную вышэйшага органа дзяржаўнай улады: і агульнадзяржаўныя, і мясцовыя. Безумоўна адно: у гэтых зваротах, як у люстры, відаць тыя змены, што адбываюцца ва ўсіх сферах жыцця.

Звароты — гэта, як правіла, голас людзей адказных, якія не жадаюць лічыцца з бюракратызмам, раскай, карозіяй улады, валакітай. Гэта і абарона чалавечай годнасці, сваіх правоў, грамадзянскіх інтарэсаў.

Але нельга не сказаць і пра тое, што пэўная колькасць людзей не ведае, а часам і не хоча ведаць абвешчанае ў артыкуле 7 Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь палажэння аб тым, што падзел заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады з'яўляецца важнейшым прынцыпам існавання незалежнай рэспублікі, як прававой дзяржавы, і патрабуе ў імя сваіх карыслівых мэт умяшання ў дзейнні выканаўчай улады, судовых і праваахоўных органаў.

Надаючы важнае значэнне разгляду вусных зваротаў, Прэзідыум ВС Рэспублікі Беларусь зацвердзіў графік прыёму грамадзян кіраўніцтвам і членамі Прэзідыума (старшынямі пастаянных камісій). Рэгулярна вядзецца прыём Старшынёй ВС і яго намеснікамі. Апрача гэтага, штодзённы прыём наведвальнікаў праводзіцца адным са старшынь пастаянных камісій, таксама адказнымі работнікамі Сакратарыята ВС. Папярэдні запіс на прыём, за выключэннем Старшыні Вярхоўнага Савета і яго намеснікаў, не вядзецца.

Толькі ў гэтым годзе на прыёме пабывала больш 4 тысяч наведвальнікаў. З іх больш за тысячу прынята кіраўніцтвам ВС і членамі Прэзідыума, старшынямі пастаянных камісій.

Непасрэдна Старшынёй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіславам Станіслававічам Шушкевічам прынята больш 100 чалавек.

Адрас прыёмнай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь: г. Мінск, Дом урада, правае крыло, кабінет № 158. Даведкі па тэлефонах: 20-83-26, 20-36-87, 29-61-86, 29-60-86.

Тры гадзіны працягваўся прыём у Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслава Шушкевіча. З рознымі пытаннямі ішлі людзі. Адны выходзілі задаволеныя, другія засмучаныя. Аказваецца, не ўсё можа Старшыня. Напрыклад, самае элементарнае: падняць тэлефонную трубку і загадаць даць кватэру ці выдзеліць памяшканне, надзел зямлі.

Гэта ўсё ў кампетэнцыі мясцовых улад. Толькі тыя штосьці не спяшаюцца выконваць прынятыя законы. На нізе пакуль што надзейна працуе стары адладжаны механізм, і калі з'яўляюцца нейкія Швецы і хочуць памяняць шасцерні, рытм і напрамак руху стрэлак, то дзе-нідзе ў «запаведных зонах», «пушчах», «заказніках», «вотчынах» гэта ўспрымаецца страшней, чым чарнобыльская катастрофа. А папрабуй скажы такому мясцоваму васалу і князьку: «Дзядзечка, твой лыч у брудзе»,—як адразу ж пачнецца «паляванне». Ату яго, да нагі, да пазногця. Таму едуць і ідуць хадакі ў Вярхоўны Савет, Прэзідыум, да самога Старшыні шукаць мазолістую праўду-матку.

Дык ці ўсё можа Старшыня Вярхоўнага Савета? Аказваецца, не ўсё. Ды і не яго гэта справа, каму колькі зямлі выдзеліць, вуліцу заасфальтаваць, абараніць пакрыўджанага ад таго ж Івана Пятровіча. Ёсць для гэтага адпаведныя законы, якія прымаюцца пад яго кіраўніцтвам. Толькі выканаўцы на месцах любымі шляхамі і спосабамі імкнуцца іх ігнараваць і сабатаваць пад летаргічны сон кантрольных органаў. Шушкевіч у адносінах да такіх настроены бескампрамісна і гатоў усімі цывілізаванымі сродкамі змагацца з закасцянелымі бюракратамі.

Іван РУБІН, аглядальнік «Народнай газеты».

Рэзананс

«Неприкосновенный Пальчевский»

В связи с публикацией в «Народной газете» 24 октября 1991 года статьи под таким заглавием прокуратура Минской области сообщает, что следственным отделом УВД Мингорисполкома проводится дальнейшее расследование уголовного дела. В процессе проведения ревизии проверяется фондовое и фактическое поступление дефицитных товаров в Молодечненский райпотребсоюз за 1990-91 годы, соблюдение установленного порядка их распределения и реализации, причастность Пальчевского Н. Ф. к другим нарушениям закона.

Пальчевский Н. Ф. по выявленным фактам нарушений правил торговли подлежит привлечению к уголовной ответственности. Однако Молодечненский районный Совет, депутатом которого он является, не дал на это согласия. Фактически — с учетом распределения голосов — решение принято не было.

Президиум Минского областного Совета народных депутатов предложил Молодечненскому районному Совету повторно рассмотреть данный вопрос на своей сессии, которая ориентировочно состоится в декабре.

Прокуратурой области осуществляется надзор за ходом расследования и соблюдением при этом законности.

Г. РУСЕЦКИЙ, первый заместитель прокурора Минской области.

***

Вопросы, поставленные в статье «Неприкосновенный Пальчевский», будут рассматриваться повторно на очередной сессии Молодечненского районного Совета народных депутатов.

В. КАЛАЧИК, заместитель председателя Молодечненского районного Совета, народный депутат СССР.

***

Редакции стало известно: первый заместитель Генерального прокурора Республики Беларусь В. Кондратьев продлил срок следствия по данному уголовному делу до 5 марта 1992 года.

Міласэрнасць

ДАБРЫНЯ—НАЙЛЕПШАЕ ЛЯКАРСТВА

У прыгожым двухпавярховым будынку ў Талачыне «прапісаліся» раённы цэнтр міласэрнасці і мясцовае таварыства інвалідаў. Ва ўтульных пакоях можна пачытаць свежыя газеты і часопісы, паглядзець тэлевізар, папіць чаю, адвесці душу ў гаворцы, набыць раўнавагу.

